2. *Цішка, Гартны*. Дваццаць гадоў назад (успаміны з мінулага) / Цішка Гартны // Полымя, 1929. – № 5. – Мінск,1929. – С. 162–180.
3. Документы и материалы по истории Белорусии (1900-1917 гг.) / Т.3: (1900–1917 гг.) / под ред. В. Н. Перцева [и др.]. – Минск, 1953. – 1018 с.
4. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4-х т. Т. I. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. – Минск,1984. – 400 с.
5. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1907 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1909. – 156 с.
6. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1909 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1910. – 195 с.
7. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1912 г. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1913. – 318 с.
8. ЦДГАУ у Кіеве. – Фонд 575. – Спр. 610. – Воп. 1. Арк. 1–25. Пояснительная записка старших фабричных инспекторов статистическим данным об увечьях рабочих на фабриках Киевского фабричного округа в 1911 г.
9. ЦДГАУ у Кіеве. – Фонд 575. – Воп. 1. – Спр. 599. – Арк. 18. Пояснительная записка старших фабричных инспекторов статистическим данным об увечьях рабочих на фабриках Киевского фабричного округа в 1912 году. Могилёвская губерния.
10. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). ПСЗРИ. – ПСЗ. Собр. III. – Т. XXIII. – Отд. 1. – № 23060.
11. ПСЗРИ. Собр. III. – Т. XXXII. – СПб., 1915. – № 37444–37447.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*А. І. Мастыка*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*A. I. Mastyka*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)**

# ФОНД УНІВЕРСІТЭТА СТЭФАНА БАТОРЫЯ Ў ЛІТОЎСКІМ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ АРХІВЕ З ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА СКЛАДНІКА Ў ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА (1919–1939)

# THE FUND OF STEFAN BATORY UNIVERSITY IN THE LITHUANIAN CENTRAL STATE ARCHIVE FROM THE PERSPECTIVE OF STUDYING THE BELARUSIAN COMPONENT IN VILNIUS UNIVERSITY (1919–1939)

*У артыкуле разглядаюцца матэрыялы архіва Універсітэта Стэфана Баторыя з мэтай выяўлення архіўных спраў, датычных беларускай праблематыкі. Архіўныя матэрыялы, якія прадстаўлены ў артыкуле, адлюстроўваюць: дзейнасць універсітэта з перспектывы рэалізацыі адміністрацыяй Універсітэце Стэфана Баторыя сваёй нацыянальнай і культурнай палітыкі ў дачыненні да груп студэнтаў нацменшасцяў; дзейнасць і гісторыю існавання беларускіх студэнцкіх арганізацый пры Універсітэце Стэфана Ба-*

*торыя. Таксама выяўлены комплекс дакументы, якія змяшчаюць персанальныя дадзеныя студэнтаў і выкдадчыкаў беларусаў, а таксама статыстычныя дадзеныя, якія дазваляюць падрабязна даследаваць нацыянальны склад, сацыяльнае паходжанне студэнтаў універсітэта.*

*Ключавыя словы: Універсітэт Стэфана Баторыя, беларускія студэнцкія арганізацыі, Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў, Вільня, Заходняя Беларусь.*

*The article considers the fund 175 of the Lithuanian Central State Archive, which stores the archive of the University of Stefan Batory in Vilnius 1919–1939. The purpose of the article is to recognize archival files that relate to Belarusian issues in the history of the university.*

*Archival materials, which are provided in the article, reflect: the activities of the university from the perspective of the implementation by the administration of the university of national and cultural policy in relation to national minority students groups; activities and history of the existence of Belarusian student organizations at the university.*

*Also, the athor revealed a selection of documents that contain personal data of Belarusian students and professors, as well as statistical data that allow to research of the national composition and social origin of the students of Vilnius University.*

*Key words: University of Stefan Batory in Vilnius, Belarusian student organizations, Lithuanian Central State Archive, Vilnius, Western Belarus.*

Калі разглядаць гісторыю нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай, то адной з нявывучаных яе старонак будзе беларуская студэнцкая супольнасць ва ўніверсітэце імя Стэфана Баторыя (далей – УСБ) у Вільні, а таксама дзейнасць і значэнне самога ўніверсітэта для навукова-асветніцкага і грамадскага развіцця краю наогул. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэматыка УСБ і беларускай супольнасці гэтага ўніверсітэта разглядаецца галоўным чынам толькі ў сувязі з дзейнасцю Беларускага студэнцкага саюза, гісторыі якога прысвечаны некалькі асобных артыкулаў [1–3]. Агульны агляд усіх існаваўшых беларускіх арганізацый ва УСБ быў зроблены ў невялікім артыкуле У. Серпухавым [4]. Даследаванню моладзевага руху ў Заходняй Беларусі агулам прысвечаны манаграфіі В. Крывуця [5] і У. Ляхоўскага[6], дзе пэўная ўвага надаецца беларускаму студэнцкаму руху ва УСБ, але толькі ў пераліку іншых арганізацый і партый Заходняй Беларусі. Асобнага даследавання, прысвечанага УСБ і беларускай складаючай, у ім пакуль не існуе.

Прычынай такой сітуацыі з’яўляецца недаследаванасць архіўных матэрыялаў, датычных гісторыі Віленскага ўніверсітэта 1919–1939 гг., і абмежаванасцю доступу беларускіх навукоўцаў да непасрэдных крыніц. Асноўныя матэрыялы па дзейнасці УСБ захоўваюцца зараз ў Вільні і змешчаны ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве (далей – ЛЦДА). У сваю чаргу, варта яшчэ адзначыць, што дагэтуль ў беларускай гістарыяграфіі адсутнічае разуменне вартасці Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя для беларускай справы з прычыны нацыянальна-польскага характару гэтай вышэйшай навучальнай установы. Змяніць дадзеную сітуацыю можа вывучэнне архіўных крыніц з перспектывы нацыянальна-культурнай палітыкі ўніверсітэта, беларускай нацыянальнай складаючай студэнцкай супольнасці і выкладчыцкім асяроддзі, дзейнасці беларускіх студэнцкіх

арганізацый і жыцця беларускага студэнцтва УСБ наогул.

Матэрыялы архіву УСБ змяшчаюцца ў фондзе № 175 ЛЦДА, які ўтрымлівае ў сябе 15 вопісаў, уключаючых агульнай колькасцю 19 866 адзінак захоўвання. Мова дакументацыі – польская. Дакументы фонду датуюцца ў храналагічных межах ад 1918 па 1940 г. Архіў змяшчае велізарную колькасць матэрыялаў, якія ахопліваюць пераважную большасць дакументальных сведчанняў, якія адлюстроўваюць дзейнасць універсітэта. Варта адзначыць, што праца ўніверсітэта праяўлялася ў вельмі разнастайных сферах: акадэмічная, гаспадарчая, адміністратыўная, навуковая і інш. Кароткае апісанне зместу 175 фонда ЛЦДА размешчана ў табліцы 1.

*Табліца 1*

**Структура і кароткае апісанне зместу «Архіва УСБ», размешчанага ў фондзе № 175 ЛЦДА**

| № вопісу | Даты дакументаў | Назва | Апісанне |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | 1918–1939 | Канцылярыя УСБ | Вопіс змяшчае: канцылярская дакументацыя, дырэктыўныя дакументы і акты рэгламентуючыя дзейнасць універсітэта, пратаколы паседжання сенату універсітэта, навіны, перапіска, справаздачнасць па арганізацыйным і працоўным пытанням, асабістыя справы персаналу, прафесарскага складу і выкладчыкаў і г. д. Тут жа ўтрымліваюцца дакументы па агульных справах студэнцкіх таварыстваў |

<table>
<tr><td>2</td><td>1919–1939</td><td>Факультэт права<br>і юрыдычных<br>навук</td><td rowspan="8">Вопісы, якія ўключаюць у сябе справы па дзейнасці сямі факультэтаў УСБ, па змесце і структуры падобныя, што абумоўлена аднатыпнасцю ўкладзеных у іх дадзеных. Асноўны змест гэтых спраў: пратаколы пасяджэнняў дэканата факультэта, статуты факультэтаў, прашэнні студэнтаў на залічэнне стыпендыяй, на атрыманне інтэрнатаў, на адтэрміноўку ўзносу за навучанне, заявы студэнтаў, асабістыя справы студэнтаў, спісы прафесараў і выкладчыкаў, справы па стыпендыям, экзаменам, аплаты навучання, фінансавая дакументацыя і па матэрыяльнаму кантролю, пратаколы экзаменацыйнай камісіі ды іншая канцылярска-справаводная і фінансава-справаздачная дакументацыя. Таксама кожны факультэт меў і пэўныя асаблівасці ў справаводстве, што залежала ад яго спецыфікі (як, напрыклад, на медыцынскім факультэце дакументальна адлюстраваны стасункі і супрацоўніцтва з клінікамі і шпіталямі, таксама ёсць справы наконт медыцынскага персаналу, які быў замацавана за факультэтам)</td></tr>
<tr><td>3</td><td>1919–1939</td><td>Медыцынскі<br>факультэт</td></tr>
<tr><td>4</td><td>1919–1939</td><td>Фармацэўтычнае<br>аддзяленне пры<br>медыцынскім<br>факультэце</td></tr>
<tr><td>5</td><td>1919–1939</td><td>Гуманітарны<br>факультэт</td></tr>
<tr><td>6</td><td>1919–1940</td><td>Факультэт матэма-<br>тычны<br>і прыродазнаўчых<br>навук</td></tr>
<tr><td>7</td><td>1919–1939</td><td>Аграрны<br>факультэт</td></tr>
<tr><td>8</td><td>1919–1939</td><td>Тэалагічны<br>факультэт</td></tr>
<tr><td>9</td><td>1920–1939</td><td>Факультэт<br>мастацтва</td></tr>
<tr><td>10</td><td>1919–1939</td><td>Фінансава-<br>гаспадарчы аддзел</td><td>У вопісу змешчаны фінансавыя планы, бухгалтарскія справаздачы і даклады, касавыя кнігі, выплата жалаванняў ды інш.</td></tr>
<tr><td>1</td><td>2</td><td>3</td><td>4</td></tr>
<tr><td>11</td><td>1925–1939</td><td>Экзаменацыйная<br>камісія</td><td>Матэрыялы экзаменацыйных камісій</td></tr>
<tr><td>13</td><td>1920–1940</td><td>Інвентарны вопіс</td><td>Справы факультэтаў: медыцынскага, аграрнага і мастацтваў. Асабістыя справы служачых універсітэта</td></tr>
<tr><td>14</td><td>1920–1939</td><td>Асабовыя справы<br>служачых<br>і працоўных УСБ</td><td>Матэрыялы, якія адносяцца да асабістых дадзеных персаналу ўніверсітэта</td></tr>
<tr><td>15</td><td>1927–1939</td><td>Студэнцкія тава-<br>рыствы, саюзы,<br>карпарацыі<br>і гурткі пры УСБ</td><td>Справаводства і справаздачнасць студэнцкіх таварыстваў, дакументы, якія рэгламентавалі працу арганізацый, даклады па нагляду за дзейнасцю студэнцкіх арганізацый</td></tr>
</table>

З велізарнага комплексу дакументальных сведчанняў, якія зафіксавалі дзейнасць універсітэта за два міжваенных дзесяцігоддзі, неабходныя для вывучэння беларускага аспекту ў гісторыі ўніверсітэта, матэрыялы можна падзяліць на наступныя тры групы:

1. Дакументы, што адлюстроўваюць гісторыю і дзейнасць універсітэта з перспектывы рэалізацыі адміністрацыяй УСБ сваёй нацыянальнай палітыкі.

2. Матэрыялы па справах беларускіх студэнцкіх арганізацый пры УСБ.

3. Дакументы, якія змяшчаюць персанальныя дадзеныя студэнтаў і выкладчыкаў-беларусаў.

Да першай групы адносіцца шырокі спектр матэрыялаў канцылярыі УСБ: пратаколы паседжанняў розных канферэнцый, камісій, збораў. У першую чаргу нас цікавілі паседжанні рэктарата па пытаннях прыняцця новых статутаў «Аб акадэмічных школах», разгляды статутаў беларускіх студэнцкіх арганізацый, студэнцкіх хваляванняў на нацыянальнай глебе і г. д. Таксама ў нашым выпадку ўяўляюць цікавасць пратаколы дысцыплінарных камісій па справах асобных арганізацый і студэнтаў, расследаванні наступстваў студэнцкіх хваляванняў, акадэмічных судоў і т. п. Важнымі з пункту гледжання палітыкі, якая праводзілася ў дачыненні да нацменшасцяў, з’яўляюцца вынікі дзейнасці стыпендыяльных камісій.

Пазіцыю адміністрацыі УСБ адносна палітыкі, якая праводзілася Міністэрствам адукацыі і існуючыя рознагалоссі можна прасачыць на аснове наступных дакументаў. Найперш, гэта перапіска і справаводства, якія адлюстроўваюць узаемадзеянне з Міністэрствам адукацыі па праблеме ўводзення новых нормаў, у прыватнасці, новых статутаў «Аб акадэмічных школах», якія выходзілі ў 1920, 1933 і 1937 гг. і закраналі пытанні абмежавання аўтаноміі ўніверсітэтаў і акадэмічных свабод, арганізацыі нагляду за студэнцкімі таварыствамі. Увесь пералік дакументаў змяшчаецца ў зборы матэрыялаў канцэлярыі УСБ [7].

Да другой групы адносяцца матэрыялы справаводства студэнцкіх арганізацый, дакументы, якія рэгламентавалі працу арганізацый, даклады, складзеныя на аснове справаздачнасці студэнцкіх таварыстваў. Яны прадстаўлены як у выглядзе асобных спраў пэўных студэнцкіх аб’яднанняў [8], так і ў выглядзе агульных збораў матэрыялаў па працы студэнцкіх таварыстваў, класіфікаваных у залежнасці ад кірунку дзейнасці: ад навуковых гурткоў па пэўных дысцыплінах [9–10], да спартыўных аб’яднанняў [11]. Дадзеныя матэрыялы справаводства студэнцкіх арганізацый складаюцца з дакументаў, якія рэгламентавалі іх дзейнасць: спісаў асабістага склада і кіраўніцтва арганізацый; пратаколаў паседжанняў агульных сходаў і выбараў; дакументаў, звязаных з правядзеннем розных афіцыйных мерапрыемстваў; перапіскі і зваротаў да адміністрацыі.

Беларускімі арганізацыямі, якія дзейнічалі ва УСБ у перыяд з 1919 па

1939 г., з’яўляліся: Беларускі студэнцкі саюз (БСС), Таварыства прыяцеляў беларусазнаўства, Студэнцкая карпарацыя «Скарынія», Беларускае студэнцкае таварыства імя Ф. Скарыны, Беларускае студэнцкае краязнаўчае таварыства, Саюз студэнтаў-народнікаў імя Ф. Багушэвіча. У матэрыялах 175 фонду ЦДАЛ дакументы, якія непасрэдна датычацца дзейнасці гэтых арганізацый, змешчаныя ў наступных справах.

• Справа арганізацыі «Беларускі студэнцкі саюз» (1933/34–1939 гг.) [8], 95 старонак. Асноўныя змест справы: спісы членаў Беларускага студэнцкага саюза, паданні аб перавыбарах управы БСС і паведамленні аб зменах у складзе ўправы, статут БСС, зацверджаныя статутам яго варыянты і таксама варыянты статута з выпраўленнямі, фінансавыя справаздачы БСС, справаздачы па дзейнасці БСС, узоры адзнак БСС (эскізы фуражкі і банды) з заявай да Віленскага ваяводы аб легалізацыі гэтых адзнак, прашэнні да рэктара аб правядзенні культурных мерапрыемстваў, сходаў, канцэртаў, вечарын, святкаванняў і прашэнне дазволу на карыстанне памяшканняў універсітэту дзеля гэтых мэтаў, праграмы і планы правядзення мерапрыемстваў, зварот да сената аб назначэнні куратара для БСС і Таварыства прыяцеляў беларусазнаўства.

• Справаводства Таварыства прыяцеляў беларусазнаўства (ТПБ) [12] прадстаўлена за перыяд 1933–1939 гг., 83 старонкі. Змест дадзенай справы наступны: прашэнне да сенату аб зацвярджэнні статута арганізацыі з прыкладзеным спісам членаў таварыства, спіс членаў ТПБ, статут ТПБ, паданні аб перавыбарах управы БСС і паведамленні аб зменах у складзе ўправы (рады), пералік дакладаў, якія чыталіся падчас сходаў навуковых ТПБ, справаздачы па дзейнасці ТПБ, «Апытальнік да збірання дыялектычных і некаторых агульных асаблівасцяў беларускага (крывіцкага) языка» Я. Станкевіча выдадзены ў 1935 г. у Вільні дзякуючы намаганням ТПБ, разнастайныя прашэнні да рэктара (аб правядзенні сходаў і пасяджэнняў, аб атрыманні ў бясплатнае карыстанне памяшкання для патрэб ТПБ).

• Справа Беларускага студэнцкага таварыства імя Ф. Скарыны (БСТ) [13], ахоплівае 1934–1936 гг., усяго 18 старонак. Тут прадстаўлены наступныя дакументы: прашэнне да сенату аб зацвярджэнні статута БСТ з прыкладзеным спісам членаў таварыства, спісы членаў БСТ, прашэнні і заявы да рэктара па пытаннях дзейнасці арганізацыі.

Інфарматыўным і змястоўным зборам дакументам з’яўляюцца «Агульныя справы студэнцкіх таварыстваў» [14–15]. Сыходзячы з назвы справы, зразумела, што яе матэрыялы будуць утрымліваць агульныя дакументы, датычныя дзейнасці ўсіх студэнцкіх арганізацыяў УСБ. Таму пры вывучэнні гісторыі любой з акадэмічных таварыстваў пры УСБ мы будзем вымушаны звярнуцца да гэтай справы. Тут мы вылучым тыя дакументы, якія звязаны з дзейнасцю беларускіх таварыстваў: прашэнне да рэктара УСБ аб зарэгістраванні новаўтворанай арганізацыі «Беларускае студэнц-

кае краязнаўчае таварыства (БСКТ)» [14, арк. 314], статут БСКТ, прашэнне да рэктара аб зарэгістраванні новаўтворанай арганізацыі «Саюз студэнтаў-народнікаў імя Ф. Багушэвіча» і зацвярджэнні яе статута, статут гэтага саюза, загад рэктара аб скасаванні Саюза студэнтаў-народнікаў імя Ф. Багушэвіча за невыкананне ўмоў, якія прапісаны ў статуце і адсутнасці справаздач ад арганізацыі.

Дзейнасць беларускія студэнцкія арганізацыі апісваецца і ў дакументах справы «Таварыстваў ідэйна-выхаваўчыя» (1935–1937 гг.) [16]. Гэта шэраг абвестак і аб'яў пра культурныя мерапрыемствы, лекцыі, вечарыны, канцэрты, святкаванні, якія арганізоўваліся сябрамі БСС.

Асобна вылучаецца такая катэгорыя дакументаў як «Справаздачнасць па справах студэнцкіх аб'яднанняў і арганізацый матэрыяльнай узаемадапамогі студэнцкай моладзі» (за перыяд 1934–1937 гг.) [17]. Гэтыя матэрыялы ўяўляюць сабой аналіз і ацэнку кіраўніцтвам УСБ дзейнасці студэнцкіх арганізацый на падставе іх справаздачнасці за навучальны год. Дадзеная аналітычная запіска прызначалася для патрэб Міністэрства адукацыі, яе складанне было ўведзена палажэннем 1933 г. Важнасць дадзеных матэрыялаў у тым, што тут была прадстаўлена не толькі ацэнка працы пэўных таварыстваў з пункту гледжання адміністрацыі УСБ, але і разглядалася сітуацыя ў цэлым: улічваліся настроі, тэндэнцыі ў студэнцкім асяроддзі. У дадзеным выпадку цікавасць уяўляюць і самі катэгорыі, у якіх кіраўніцтва ацэньвае дзейнасць, у нашым выпадку, беларускіх арганізацый.

Структура дакумента справаздачы аб дзейнасці студэнцкіх таварыстваў УСБ мае наступны выгляд. Напачатку разглядаецца агульная паспяховасць працы таварыстваў за года, вызначаюцца тыя арганізацыі, якія былі зарэгістраваны цягам года, а таксама тыя таварыствы, дзейнасць якіх была спынена па вынікам працы за год. Далей аналіз працы арганізацыяў разглядаецца па асобным групам у залежнасці ад іх скіраванасці дзейнасці. Калі ў жыцці арганізацыі за год адбываліся надзвычайныя падзеі ёй мог быць прысвечаны асобны параграф, але ў любым выпадку кароткая характарыстыка па дзейнасці арганізацыяў кожнага кірунку. Усе арганізацыі былі падзелены на наступныя групы: навуковыя таварыствы (колы), таварыствы самадапамогі, ідэйна-выхаваўчыя таварыствы, рэгіянальныя таварыствы, карпарацыі.

Беларускія арганізацыі адносіліся да нацыянальных таварыстваў разам з аб'яднанямі студэнтаў-украінцаў і студэнтаў-літоўцаў і ўключаліся ў групу ідэйна-выхаваўчых. Таварыства прыяцеляў беларусазнаўства з'яўлялася колам навуковым, поспехі навуковых таварыствах у справаздачы кіраўніцтва УСБ ацэньваліся па наступным фактарам: навуковая праца (правядзенне навуковых сходаў, чытанне дакладаў), выдавецкая дзейнасць, арганізаванасць самадапамогі сябрам кола, улічвалася арганізаванасць бібліятэкі і яе фонды.

Да трэцяй групы матэрыялаў архіва УСБ, якія вартыя разгляду пры

даследаванні з беларускай перспектывы, адносяцца персанальныя дадзеныя беларускіх студэнтаў, якія можна пазначыць як асабовыя справы студэнтаў: аўтабіяграфіі, анкеты, асабістыя заявы і звароты да кіраўніцтва і г. д. Для прыкладу можна прывесці асабовую справу студэнта факультэта права Леаніда Галяка [18]. Дадзеныя матэрыялы могуць выкарыстоўвацца, напрыклад, для вызначэння сацыяльнага паходжання студэнтаў, бо тут у большасці выпадкаў пазначалася прафесійная занятасць бацькоў студэнтаў. Падобную інфармацыю можна запазычыць і з аўтабіяграфій студэнтаў. У асобных выпадках захаваліся матэрыялы выпускных іспытных і дыпломных камісій, як самі вынікі экзаменацыйных выпрабаванняў, так і дыпломныя працы. Напрыклад, у выпадку асабовай справы студэнткі гуманітарнага факультэта Катковіч Анэлі [19]. Гэта таксама дазваляе судзіць пра пэўную скіраванасць навуковай інтарэсаў беларускіх студэнтаў.

Для вывучэння колькаснага складу беларускай студэнцкай супольнасці могуць прыдацца статыстычныя матэрыялы, якія друкаваліся ў штогадовых брашурах УСБ. Напрыклад, такая статыстыка за 1920/1921 навучальны года падавалася ў выданні «Пералік прадметаў і склад універсітэта ў 1920/1921 навучальным годзе» [20]. Напачатку гэтая брашура мела выключна прыкладное інфарматыўнае значэнне. Але да канца 1930-х выданне стала больш змястоўным і друкавалася ўжо пад назвай «Гадавік УСБ» [21]. Гэтыя матэрыялы ўтрымоўваюць спіс усіх дысцыплін і выкладчыкаў па факультэтах, колькасны склад універсітэта на аснове статыстычных дадзеных, якія збіраліся ўніверсітэтам пра студэнтаў, а таксама, па неабходнасці, інфармацыю пра важныя падзеі ў жыцці УСБ за год. У статыстыцы ўтрымоўваліся дадзеныя і пра нацыянальнае паходжанне студэнтаў, якое да 1927/1928 навучальнага года пазначалася як непасрэдна нацыянальнасць, а пасля вызначалася па роднай мове. Гэтыя дадзеныя складаліся на падставе анкет, якія кожны трыместр запаўнялі студэнты УСБ. Пытанне пра нацыянальнасць і мову было толькі адным са мноства пунктаў дадзенай анкеты, дзе сярод іншага паказваліся асабовыя дадзеныя, веравызнанне, інфармацыя пра бацькоў, пералік курсаў і дысцыплін, якія студэнт праходзіў у гэтым трыместры, інфармацыя пра аплату навучання і г. д.

Аналіз дакументаў 175-га фонду ЦДАЛ дае нам магчымасць сцвярджаць, што гэтыя матэрыялы з’яўляюцца падставай для правядзення шырокага кола даследаванняў па гісторыі Віленскага універсітэту імя Стэфана Баторыя (1919–1939). Адным з відавочных і перспектыўных кірункаў даследавання можа стаць вывучэнне беларускай студэнцкай супольнасці УСБ і праяў яе актыўнасці – студэнцкіх аб’яднанняў і таварыстваў. Агляд фонду 175 паказаў нам наяўнасць матэрыялаў, якія з’яўляюцца неабходнай крыніцай для вывучэння гэтай тэмы.

Аднак наш аналіз дэманструе толькі найбольш відавочныя даследчыя тэмы, непасрэдна звязаныя з беларускай прысутнасцю ў УСБ. Больш па-

драбязнае вывучэнне гэтых матэрыялаў можа адказаць на важнае і актуальнае пытанне аб значэнні універсітэта ў соцыя-культурным развіцці Заходняй Беларусі. Бо, нягледзячы на свой польскі характар, як адукацыйны і акадэмічны цэнтр унверсітэт, безумоўна, аказваў значную ролю ў развіцці культурна-асветніцкім развіцці і навуковага асяродуку, які быў рухавіком развіцця навукі ў рэгіёне, у даследчых кірунках, якія непасрэдна звязаны з беларускай праблематыкай. Аказваў уплыў на студэнтаў, якія пасля ўваходзтлі ў эліту грамадства. Такое даследаванне, несумнеўна, патрабуе вывучэнне дзейнасці паасобных дзеячаў, навуковых школ, навучальных праграм, унутраных і знешніх уплываў на акадэмічнае і студэнцкае асяроддзе УСБ, што вымагае як больш падрабязнага вывучэння спраў асобных факультэтаў, так і прыцягненнем вялікага комплексу іншых крыніц (выданняў, перыёдыкі, успамінаў), у тым ліку архіўныя фонды, якія зараз размешчаны ў Польшчы і Беларусі. Напрыклад, архіўныя матэрыялы праўлення Беларускага студэнцкага саюзу пры ўніверсітэце імя Стэфана Баторыя, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь [22].

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Ярмалковіч, В.* Беларускі студэнцкі саюз (БСС) у Вільні / В. Ярмалковіч // Весткі Інстытута Беларусаведы ў Ляймэн (Нямеччына). – 1993. – № 8. – С. 1–25.

2. *Мазец, В.* Беларускі студэнцкі саюз як фактар нацыянальна-культурнага жыцця моладзі Заходняй Беларусі / В. Мазец // Зборнік Праблемы ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. – Мінск, 2000. – С. 78–85.

3. *Мастыка, А.* Беларускі студэнцкі саюз ва універсітэце Стэфана Баторыя ў Вільне (1921–1939) / А. Мастыка // Biuletyn Historii Pogranicza. – 2009. – № 10. – С. 5–21.

4. *Серпухаў, У.* Беларускія студэнцкія арганізацыі Віленскага універсітэта (1919–1939) / У. Серпухаў // Białoruski Zeszyty Historyczne. – 2007. – Т. 28. – С. 54–68.

5. *Кривуть, В. И.* Молодёжные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939) / В. И. Кривуть. – Минск, 2008. – 166 с.

6. *Ляхоўскі, У.* Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх моладзевых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – Беласток-Вільня: Беларускае гістарычнае таварыства – Інстытут беларусістыкі, 2012. – 483 с.

7. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (ЛЦДА). – Ф.175. – Воп. 1.

8. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 15. – Спр. 58.

9. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 1. – Спр. IA559.

10. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 1. – Спр. IA563.

11. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 1. – Спр. IA575.

12. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 15. – Спр. 7.

13. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 15. – Спр. 14.

14. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 1. – Спр. IA557.

15. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 1. – Спр. IA558.

16. ЛЦДА. – Фонд175. – Воп. 1. – Спр. IA571.

17. ЛЦДА. – Ф. 175. – Воп. 15. – Спр. 33.

18. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 2. – Спр. VICa1863.

19. ЛЦДА. – Фонд 175. – Воп. 5. – Спр. IVCa 188.

20. III spis wykładów i skład uniwersytetu w roku akademickim 1920/21. – Wilno [без даты]. – 44 s.

21. Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1937–1938. – Wilno [без даты]. – 55 s.
22. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 884. – Воп. 1.

**(Дата подачи: 28.02.2019 г.)**

*О. Г. Машаров*
Институт пограничной службы Республики Беларусь, Минск
*O. Masharov*
The Institute of Border Service of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 351.746(476)+(470)**

# ПОГРАНИЧНЫЙ КОМИТЕТ – ОТРАСЛЕВОЙ ОРГАН СОЮЗА БЕЛАРУСИ И РОССИИ: СОЗДАНИЕ, ФУНКЦИИ, ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ (1997–2000 гг.)

# BORDER COMMITTEE – THE SECTORAL BODY OF BELARUS AND RUSSIA UNION: ESTABLISHMENT, FUNCTIONS, ACTIVITIES (1997–2000)

*В статье раскрываются вопросы создания и деятельности Пограничного комитета Союза Беларуси и России. Отмечается, что этот отраслевой орган был создан для организации взаимодействия и координации пограничных ведомств Беларуси и России при решении пограничных вопросов. Анализируется нормативно-правовая база, на основании которой функционировал Пограничный комитет. Отмечается, что комитет сосредоточил свою деятельность на выработке и реализации согласованной пограничной политики Союза. С этой целью осуществлялась постепенная гармонизация нормативно-правовой базы пограничных ведомств Беларуси и России. Делается вывод, что основное внимание в деятельности комитета уделялось разработке и реализации совместных программ, направленных на обеспечение надежной охраны границ двух государств.*
*Ключевые слова: Республика Беларусь; Российская Федерация; Пограничный комитет Союза Беларуси и России; государственная граница; взаимодействие.*

*The article covers some issues concerning the establishment and activities of the Border Committee of Belarus and Russia Union. It is significant that this sectoral body was created in order to arrange the interaction and coordination of border agencies of Belarus and Russia in solving border issues. The regulatory framework of the Border Committee functioning is analyzed. It is noted that the Committee focused its activities on the development and implementation of the coordinated border policy of the Union. To this end, a gradual harmonization of the regulatory framework of the border agencies of Belarus and Russia was carried out. The main activities of the Committee were focused on the development and implementation of joint programs aimed at ensuring reliable protection of two states borders and arranging an interaction between the border agencies.*
*Key words: the Republic of Belarus; the Russian Federation; the Border Committee of Belarus and Russia Union; the state border; interaction.*

Приобретение Республикой Беларусь в 1991 г. независимости открыло новую страницу в отечественной истории. В 1990-е гг. Беларусь заново выстраивала взаимоотношения с бывшими союзными республиками, в том